тэкстаў дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, выдадзеныя ў XIV–XVIII стагоддзях у Беларусі. Кожная кніга на рэсурсе мае апісанне.

Акрамя таго, беларускі гісторык і калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў з дапамогай тэхналогій XVI стагоддзя аднавіў Біблію першадрукара Францыска Скарыны. Для гэтага прыйшлося сканструяваць друкавальны станок таго часу. Для выдання выкарыстоўвалася самаробная ільняная папера. Усяго на адноўленым станку было адціснута сем асобнікаў скарынаўскай Бібліі. «Станок дзеючы, і гэта вялікая рэдкасць, паколькі ў свеце аднавілі ўсяго некалькі такіх станкоў,» – падкрэсліў Ліхадзедаў [3]. Адноўленую кнігу Скарыны спачатку хацелі абкласці скураным пераплётам, аднак пазней ад гэтай ідэі адмовіліся, паколькі Біблія не выглядала б аўтэнтычна. Тады было вырашана зрабіць для Бібліі мяккую вокладку, таксама па старадаўняй тэхналогіі. Вокладку праілюстраваў беларускі мастак-графік Барыс Цітовіч. У 2018 годзе Нацыянальная бібліятэка прэзентавала галаграфічнае выданне «Бібліі» Скарыны [4].

На сённяшні дзень існуюць розныя пераклады твораў Скарыны на сучасную літаратурную беларускую мову. Асаблівае месца ў гэтым шэрагу займае кніга Алеся Разанава, выдадзеная ў 2017 г. «Маем найбольшае самі» [1]. Сучасны паэт творча інтэрпрэтуе спадчыну беларускага першадрукара. А. Разанаў на аснове 26 прадмоў Ф. Скарыны да кніг Святога Пісання робіць сваю кнігу перастварэнняў з арыгінальнымі назвамі.

Сёння ў гонар Скарыны названыя вышэйшыя ўзнагароды Беларусі: ордэн і медаль. Яго імя носяць навучальныя ўстановы і вуліцы, бібліятэкі і грамадскія аб’яднанні. Помнікі Скарыну ўстаноўлены ў Полацку, Мінску, Лідзе, Калінінградзе, Празе. Францыск Скарына – выдатны дзеяч беларускай культуры, заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання, рознабаковая дзейнасць і спадчына якога маюць сусветнае культурнае значэнне.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Разанаў, А. С. Францыск Скарына. Маем найбольшае самі. Кніга ператсвраэнняў / А. Разанаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2017. – 223 с.
2. Скарына, Ф. Творы. Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. / Ф. Скарына. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.
3. «Адноўленая» Біблія Скарыны – феномен сучаснай культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://naviny.by/rubrics/culture/2014/09/12/ic_articles_117_186703. – Дата доступу: 09.05.2020 г.
4. Галаграму Бібліі Скарыны представяць у Нацыянальнай бібліятэцы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bel.sputnik.by/culture/20180220/1033771620/gologramma-bibliya-francisk-skorina.htm. – Дата доступу: 09.05.2020 г.


УДК 947,6 (“1914 – 1918”)

# ДЗЕЙНАСЦЬ «МІНСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ ПРАЯЗДЖАЮЧЫМ ХВОРЫМ І ПАРАНЕНЫМ ВОІНАМ» У ПАЧАТКУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Хаданёнак В.М., к.г.н.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разглядаецца дзейнасць «Мінскага таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам» у пачатку Першай сусветнай вайны.*

Ключавыя словы: Першая сусветная вайна, дабрачынныя арганізацыі, грамадскія таварыствы і аб’яднанні.

Першая сусветная вайна пачалася даволі нечакана не толькі для пераважнай большасці насельніцтва, але і для дзяржаўных арганізацый і ўстаноў. Урад аказаўся слаба падрыхтаваны для забеспячэння не толькі салдат на лініі фронта, але і мясцовага насельніцтва ўсім неабходным. Эканоміка ва ўмовах ваеннага часу працавала з перабоямі.

У самым пачатку вайны прыбыццё ў Мінск кожнага цягніка з параненымі воінамі прыцягвала на вакзал шмат людзей, якія імкнуліся аказаць дапамогу, хто чым мог. Але такая

дзейнасць была неарганізаваная і не мела істотных вынікаў. Клопат пра тысячы параненых і знявечаных салдат, якія вярталіся з фронта, узялі на сябе і людзі з высокім сацыяльным і маёмасным статусам. Іх фінансавыя магчымасці дазвалялі эфектыўна займацца дабрачыннай дзейнасцю.

28 жніўня 1914 г. адбыўся агульны сход членаў Мінскага таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам [1, арк. 1]. У ім удзельнічала 183 чалавека ў якасці дзейных членаў (пры гэтым яны выплочвалі членскія ўнёскі) і 269 асоб у якасці членаў-супрацоўнікаў.

Адзінагалосна ганаровым старшынёй таварыства быў абраны начальнік Мінскай ваеннай акругі генерал ад кавалерыі барон Е. А. Рауш фон Траўнберг [1, арк. 1 адв.]. Начальнік Лібава-Роменскай чыгункі дзейны стацкі саветнік А. Г. Генрыхсан заявіў сходу, што служачыя чыгункі са спачуваннем ставяцца да ўзнікнення дадзенага таварыства і гатовы прыняць удзел у яго дзейнасці, але многія з іх па свайму фінансаваму становішчу не могуць выплаціць 3-рублёвы членскі ўнёсак і таму просяць дапусціць іх да выканання абавязкаў членаў-супрацоўнікаў. Са свайго боку чыгуначныя служачыя ахвяравалі на гэту справу 300 рублёў.

Спіс членаў праўлення Мінскага таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам быў наступны: старшыня: А. С. Далгава-Сабураў (барон Е. А. Рауш фон Траўнберг быў ганаровым старшынёй), Л. А. Гірс, граф Г. Э. Чапскі, Б. Н. Самойленка, Н. Г. Гаўрылава, В. Е. Хітрова, Е. Р. Гальеўская, В. С. Абранпольская, Н. І. Хржанстоўская, Г. А. Ваньковіч, А. К. Снітко (скарбнік), Н. І. Краўцэвіч (сакратар). Кандыдатамі ў члены праўлення сталі: Е. С. Разанава, Л. К. Карзаковіч, Н. Н. Урванцова, М. П. Ваньковіч, а членамі рэвізійнай камісіі – А. Д. Вяроўкін-Шалюта, К. Г. Генрыхсан, А. І. Святлоўская [1, арк. 1].

Мэтай таварыства, згодна са статутам, было аблегчыць становішча правозімых па чыгунках праз горад Мінск з тэатра ваенных дзеянняў хворых і параненых войнаў, шляхам прадастаўлення ім неабходных прадметаў вопраткі, абутку, харчавання, перавязачных сродкаў і інш. [2, арк. 3].

У статуце зазначалася, што таварыства складалася з неабмежаванай колькасці асобаў абодвух палоў, усіх званняў, станаў і веравызнанняў, за выключэннем непаўналетніх і навучэнцаў ніжэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Члены таварыства падзяляліся на ганаровых, дзейных і супрацоўнікаў. Ганаровымі членамі іменаваліся асобы, якія зрабілі на карысць таварыства значныя ахвяраванні ці аказалі іншыя істотныя паслугі. Дзейнымі членамі лічыліся асобы, якія ўплацілі ў касу таварыства членскі ўнёсак у памеры 3 рублёў. Членамі супрацоўнікамі з'яўляліся асобы, якія сваёй асабістай працай прымалі ўдзел у жыцці таварыства.

Сродкі таварыства складаліся з членскіх унёскаў, ахвяраванняў грошамі і рэчамі, як членаў таварыства, так і старонніх асобаў, прыбыткаў з наладжваемых таварыствам публічных лекцый, канцэртаў, спектакляў і інш. [2, арк. 3].

Кіраванне справамі таварыства ажыццяўлялася агульным сходам і праўленнем. Праўленне складалася з 12 асобаў, якіх абраў агульны сход на ўвесь час дзеяння таварыства (да заканчэння ваенных дзеянняў). На выпадак выбыцця членаў праўлення абіраліся кандыдаты колькасцю 4 чалавека. Праўленне абірала сакратара, віцэ-старшыню, старшыню, скарбніка. У абавязкі праўлення ўваходзіла: размеркаванне заняткаў паміж членамі праўлення, прыём новых членаў, членскіх унёскаў і ахвяраванняў, нарыхтоўка і раздача правозімых праз горад Мінск хворым і параненым воінам, якіх перавазілі, прадметаў вопраткі, абутку, харчавання, перавязачных сродкаў, прызначэнне дзяжурных на чыгуначныя станцыі, прадастаўленне па заканчэнні дзейнасці таварыства справаздачы агульнаму сходу па выніках сваёй работы. Агульныя сходы членаў таварыства мусілі склікацца ў пачатку дзейнасці таварыства і пры заканчэнні. У выпадку вырашэння неадкладных пытанняў, агульны сход мог быць скліканы па ініцыятыве праўлення ці па патрабаванні не меньш чым 20 членаў.

У выпадку спынення дзеяння таварыства, застаўшаяся маёмасць і капіталы мусілі паступіць ва ўласнасць Мінскай абшчыны расійскага таварыства Чырвонага Крыжа [2, арк. 7].

Неўзабаве пасля сваёй арганізацыі, кіраўніцтва таварыства размясціла заклік да ўсіх жыхароў горада. У ім зазначалася: «Правозімыя па чыгунках праз Мінск з тэатра ваенных дзеянняў хворыя і параненыя нашы воіны нярэдка маюць патрэбу ў самых неабходных прадметах, цёплай вопратцы, бялізне і харчаванні. Ідучы насустрач гэтай патрэбе праўленне Мінскага таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам звяртаецца да насельніцтва з пакорнейшай просьбай ахвяраваць: грошы, рознага кшталту бялізну, фуфайкі, шкарпэткі, башлыкі, рукавіцы, фуражкі, шапкі, валёнкі,

макраступы, цёплыя чаравікі, курткі, паўшубкі, сярмяжнае сукно, холст, каленкор, тытунь, цыгарэты, пісьмовыя прыналежнасці, паштоўкі для лістоў, а таксама прадметы харчавання: малако, хлеб, булкі, чай, цукар, віно, бульбу, капусту, буракі і інш. Ахвяраванні з удзячнасцю прымаюцца: а) на цэнтральным складзе на рагу Захар'еўскай вуліцы і Захар'еўскага завулка ў новым доме Земляробчага таварыства ўзаемнага страхавання; б) харчовыя прыпасы – на склад на Віленскім вакзале пры харчавальным пункце» [2, арк. 41].

Не заставаліся ў баку ад аказання дапамогі і тыя, хто не ўваходзіў у таварыства. Так, начальнік Лібава-Роменскай чыгункі 3 кастрычніка 1914 г. паведамляў, што 438 чалавек яго падначаленых выразілі жаданне несці дзяжурствы на харчавальным пункце [2, арк. 42].

На вакзале ў Мінску на сродкі казны і грамадскай арганізацыі былі адкрыты сталовая і барак для перавязкі параненых. Там жа было прынята рашэнне адкрыць цэнтральны рэчавы склад для прыёмкі і захоўвання ахвяруемых для параненых прадметаў [3, арк. 3].

14 верасня 1914 г. быў арганізаваны дабрачынны продаж нацыянальных сцяжкоў 6 саюзных краінаў на карысць Мінскага таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам. Чыстага прыбытку было атрымана 4 976 р. 42 капейкі [3, арк. 5 – 5 адв.].

7 кастрычніка 1914 г. На складзе, што знаходзіўся на рагу Захар'еўскай вуліцы і Захар'еўскага завулка мелася 27 шапак, 64 башлыка, 27 цёплых куртак, 80 ватных куртак, 2210 цыгарэт, 31 коўдра, 4 аршына палатна, 11 аршынаў сітца, 7 фунтаў чая, 247 фунтаў цукру, 9 фунтаў сухой крупы, 500 карабкоў запалак, ¾ фунта ваты, 107 пар рукавіцаў, 138 цёплых фуфаек, 106 цёплых кашуляў, 209 кашуляў, 148 кальсонаў, 5 рушнікоў, 76 нагавіцаў, 76 цёплых шалікаў, 50 параў шкарпэтак, 10 панчох, 25 цюфякоў і г. д. [3, арк. 8 адв.]. На сладзе агульназемскай арганізацыі на той жа момант знаходзіўся запас бялізны ў 100.000 параў і гэтага запаса было дастаткова. Недахоп адчуваўся ў цёплых рэчах, бо яны пераважна адсылаліся на пазіцыі [3, арк. 9].

23 снежня 1914 г. на складзе, які знаходзіўся пад кантролем графа Г. Э. Чапскага, было:

| Найменне | Набыта | Выдадзена | Маецца на складзе |
|---|---|---|---|
| кашулі | 1036 | 663 | 373 |
| цёплыя кашулі | 494 | 435 | 59 |
| споднікі | 978 | 579 | 399 |
| цёплыя споднікі | 244 | 154 | 90 |
| фуфайкі | 372 | 177 | 195 |
| ватовыя курткі | 100 | 55 | 45 |
| цёплыя курткі | 369 | 235 | 134 |
| нагавіцы | 439 | 265 | 174 |
| шапкі | 311 | 295 | 16 |
| пальчаткі | 919 | 634 | 285 |
| башлыкі | 106 | 92 | 14 |
| напульснікі | 99 пар | 58 | 41 |
| панчохі | 176 пар | 166 | 10 |
| анучы | 600 пар | 524 | 76 |
| шкарпэткі | 523 пары | 371 | 152 |
| шытыя шкарпэткі | 140 пар | 130 | 10 |
| чаравікі | 223 пары | 135 | 88 |
| валёнкі | 200 пар | 100 | 100 |
| мыліцы | 295 | 190 | 105 |
| цёплыя шалікі | 210 | 140 | 70 |
| коўдры | 55 | 40 | 15 |
| цыгарэты | 32910 | 30910 | 2000 |
| махорка | 670 фунт. | 470 | 200 |
| курыл. папера | 13 пачак | 13 | - |
| запалкі | 1985 карабкоў | 1265 | 720 |
| мыла | 62 фунты | 27 | 35 |
| цукар | 287 фунтаў | 260 | 27 |
| бумазея | 45 | 45 | - |
| байка | 65 аршын | 35 | 30 |
| каленкор | 60 аршын | 60 | - |
| зефір | 152 | 92 | 60 |

[3, арк. 20–20 адв.].

Мінскае таварыства ўзаемнага страхавання ад агню ахвяравала ў студзені 400 рублёў на патрэбы па аказанні дапамогі хворым і параненым воінам [3, арк. 26].

На 1-га студзеня 1915 г. гурток служачых Аляксандраўскай чыгункі (пад кантролем якога знаходзіўся склад харчовага пункта дапамогі хворым і параненым воінам) выдаткаваў 8487 рублёў 28 капеек ахвяраваных грошаў, яшчэ 2329 рублёў 4 капейкі знаходзілася ў касе [4, арк. 1]. За 4 месяцы было раздадзена: 92 715 булак (агульнаю вагою 89 пудоў), 34 фунты цукру, 46 фунтаў чаю, 37 фунтаў масла, 32 фунты солі, 7 фунтаў кавы, 9 пудоў маннай і аўсянай крупы, 8 пудоў хлеба [4, арк. 1 адв.].

Жанчыны добраахвотна дзяжурылі (5 зменаў па 15 чалавек) у дабрачыннай сталовай пры вакзале [4, арк. 50 адв.]. Яны раздавалі ежу і гарбату, пісалі лісты тым параненым, хто сам не меў магчымасці, выдавалі неабходную бялізну са склада [4, арк. 51].

Такім чынам, Мінскае таварыства па аказанні дапамогі праязджаючым хворым і параненым воінам у пачатку Першай сусветнай вайны аказала істотную ролю ў дапамозе і апекаванні салдат, якія вярталіся з фронту. Грамадства пэўным чынам салідарызавалася ў сваёй дабрачыннай дзейнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). Ф. 1102. В. 1. Спр. 1. Протоколы заседаний и список членов Минского общества оказания помощи проезжающим больным и раненым воинам. – 1914–1915.
2. НГАБ. Ф. 1102. В. 1. Спр. 2. Устав, протокол общего собрания и списки членов Минского общества оказания помощи проезжающим больным и раненым воинам. – 1914.
3. НГАБ. Ф. 1102. В. 1. Спр. 3. Протоколы заседаний и списки членов правления Минского общества оказания помощи больным и раненым воинам. – 1914.
4. НГАБ. Ф. 1102. В. 1. Спр. 4. Отчёт о деятельности Минского общества оказания помощи проезжающим больным и раненым воинам за 1914 г. Месячные отчёты о работе складов общества за 1915 год. Списки членов общества. – 1914–1915.

УДК 677.023.77

## ИНТЕРНЕТ КАК ФОРМА КОММУНИКАЦИИ И ПОЗНАНИЯ МИРА

***Чеснокова О.И., к.ф.н., доц., Дубровская О.А., маг.***

*Витебский государственный технологический университет,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*

Реферат. *В статье рассмотрены особенности Интернета как пространства массовой коммуникации и массовой информации, определены основные функциональные особенности социальных сетей в виртуальном пространстве.*

Ключевые слова: коммуникация, функции Интернета, блог, форум, дистанционное обучение.

Технологический и организационный переходы к информационному обществу – одни из самых значимых переходных процессов, происходящих во всем мире. Богатство, власть, общественное благополучие и культурное творчество в XXI веке во многом будут зависеть от ее способности развить модель информационного общества, приспособленную к ее специфическим ценностям и целям. «Интернет – это информационная технология и социальная форма, которая воплощает в себе информационную эпоху так же, как электрический двигатель был рычагом социальных и технических изменений индустриальной эпохи» [5, стр. 5].

Интернет – продукт своего времени. «Если информационная технология – это нынешний эквивалент электричества в эпоху индустриализации, то современный Интернет можно было бы уподобить энергетической системе и электродвигателю, потому что он способен поставлять «информационную энергию» для любых сфер человеческой деятельности» [5, стр. 13].

Последние годы второго тысячелетия стали свидетелями лавинообразного роста обращения к Интернету как к системе коммуникаций и организационной структуре. Почти 60